# Гродна

Пачнём нашу вандроўку па Панямонні з Гродна.

Як ніводзін іншы горад Беларусі, ён захаваў сваю гісторыю ў планіроўцы гарадскіх кварталаў, шматлікіх помніках культавага і свецкага дойлідства.

Знаёмства з горадам пачынаць лепш за ўсё з Замкавай гары. Паводле археалагічных даследаванняў, менавіта тут, над сутокай невялічкай рачулкі Гараднічанкі і Нёмана ўзнікла ў канцы X - пачатку XI стагоддзя невялікае славянскае пасяленне. У пачатку XII стагоддзя гэта ўжо княжацкая рэзідэнцыя — дзядзінец старажытнага Гродна.

Сама Замкавая гара, ці, як гэта месца часцей называюць Стары замак, — найкаштоўнейшы комплекс помнікаў культуры. Іх пералік варта пачаць з пабудоў гродзенскай школы дойлідства XII стагоддзя — руін княжацкага палаца і Ніжняй царквы, якія былі даследаваны археолагамі ў 1930-я гады.

Двухпавярховы княжацкі палац дойліды старажытнага Гродна будавалі з плітняковай плінфы, сцены ўзмацнілі і аздобілі гарызантальнымі радамі амаль неапрацаваных вялізных камянёў, падлогу ўпрыгожылі разнастайнымі па форме і колеру паліванымі керамічнымі пліткамі. Да нашых дзён дайшлі рэшткі паўночнай сцяны гэтай пабудовы.

Дамінантай дзядзінца быў каменны саборны храм, які сёння мы называем Ніжняй царквой. Па рэштках сцен, вышыня якіх ў асобных месцах перавышае 3,5 метры, можна меркаваць, што гэта быў шасціслуповы храм з трыма апсідамі (дзве з якіх знаходзіліся ў тоўшчы ўсходняй сцяны), са зрэзанымі вугламі будынка. Як і палац, храм быў узведзены з плінфы. Уважлівае вока і сёння ўбачыць на тарцах старажытных цаглін выявы клеймаў - рэльефных знакаў у выглядзе літар, зорачак і г.д. Самым характэрным канструктыўным элементам сцен Ніжняй царквы былі шліфаваныя буйныя камяні, уверсе яны змяняліся на больш дробныя. Колеравая гама іх стракатая: ад шэравата-ружовых, чорна-сініх і чорна-зялёных да карычнева-шэрых і чырванавата-фіялетавых таноў. А яшчэ вышэй дэкор складаўся з рознакаляровых паліваных керамічных плітак.



***Ніжняя царква і княжацкі палац XII ст. Рэканструкцыя У. Бычкова***

Інтэр'ер не меў фрэскавага роспісу. Толькі ў верхніх частках сцен было шмат адтулін-гарлавін спецыяльных галаснікоў, якія гарызантальна ўмуроўваліся ў сцены. Асноўны дэкаратыўны акцэнт прыпадаў на ўзорыстую падлогу з маёлікавых плітак 17 відаў зялёнага, жоўтага і карычневага колеру. У вуглах плітка

была выкладзена ў шахматным парадку, а ў падкупальным квадраце - ў выглядзе роўнаканцовага грэчаскага крыжа, што падкрэслівала сакральную ідэю храма.

Праіснавала царква нядоўга, бо ў 1183 годзе ад удару маланкі і пажару разбурылася. У другой палове XIII стагоддзя (па меркаванні большасці даследчыкаў) над руінамі Ніжняй царквы быў узведзены праваслаўны храм, назва якога таксама не захавалася, археолагі яго называюць Верхняй царквой. Гэта быў невялікі, квадратны ў плане храм з адной моцна выступаючай апсідай. Муравалі яго з двух відаў цэглы: тонкай (накшталт плінфы) і тоўстай (брусковай). Як і ва ўсіх тагачасных пабудовах, сцены царквы не атынкоўваліся. Верхняя царква праіснавала да апошняй чвэрці XVI стагоддзя, калі была разабрана пры будаўніцтве палаца караля Стэфана Баторыя. Ніжнія часткі яе сцен, адкрытыя археолагамі, захаваліся на вышыню ўсяго 1-1,5 метра і ў 1939 годзе былі перанесены ў асобны павільён.



***Замкавая гара. Сучасны выгляд***

Тут жа, на дзядзінцы, ёсць унікальнае для Беларусі збудаванне. Толькі ў Гродне ў XII стагоддзі частка абарончых сцен была ўзведзена з цэглы-плінфы і валуноў. Вышыня гэтых сцен была не менш 5 метраў, а таўшчыня дасягала 1,5 метра. Дзякуючы археолагам, сёння мы маем магчымасць дакрануцца да рэштак першых каменных пабудоў Гродна.

На суседнім плато за рэчкай Гараднічанкай знаходзіцца Барысаглебская царква, якая лічыцца вяршыняй развіцця гродзенскай школы дойлідства XII стагоддзя. Асвячэнне храма ў імя князёў Барыса і Глеба не выпадкова. Іх культ меў вельмі шырокае распаўсюджанне ва ўсходнеславянскіх княствах. Дарэчы, сыноў першага ўпамянутага ў летапісах гродзенскага князя Усеваладкі звалі таксама Барыс і Глеб.



***Барысаглебская царква XII ст. Паўночны фасад***

Барысаглебская царква мае яшчэ адну назву — Каложская. Гэта назва паходзіць ад прыгарада Пскова Каложы. Пасля пераможнага паходу князя Вітаўта ўзятыя ў палон жыхары Каложы ў 1405 годзе былі паселены непадалёк ад царквы. З таго часу гэта мясцовасць атрымала назву Каложа, а храм стаў называцца Каложскім.



Найбольш яскравай рысай храма з'яўляецца апрацоўка яго фасадаў. Уся паверхня сцен упрыгожана ўстаўкамі з каляровых валуноў і маёлікавай пліткі. Валуны плоскія і меншыя па памерах, чым у Ніжняй царкве, што надало большую ўстойлівасць сценам. Вялікія валуны сканцэнтраваны ў іх ніжняй частцы, а чым вышэй, тым камяні меншыя і пачынаюць перамяжоўвацца з маёлікавымі пліткамі, а пасля цалкам саступаюць месца керамікі — з плітак розных форм, памераў і колераў выкладзены вялікія і малыя крыжы.

У храм вялі тры арачныя ўваходы. Яго інтэр'ер упрыгожвала маёлікавая падлога, узор якой быў трохі прасцейшы, чым у Ніжняй царкве.

Калі пашчасціць Вам наведаць Каложу, звярніце ўвагу на шэрагі круглых адтулін у старажытнай муроўцы. Гэта гарлавіны гарлачоў-галаснікоў. Дойліды размясцілі галаснікі не толькі ў сценах, але і ў ступенях алтарных лесвіц, скляпеннях. Галаснікі выкарыстоўваліся як з мэтай аблягчэння вагі канструкцыі сцен, так і для выканання акустычнай і дэкаратыўнай функцый, былі рэгулятарамі вільготнаснага рэжыму. Па нізу сцен поясам праходзяць нішы, ствараючы падабенства суцэльнай аркады. Нішы і алтарная частка мелі фрэскавы роспіс. З XVII стагоддзя тут знаходзіўся (да 1915 года) цудатворны абраз Маці Божай Каложскай. Зараз у царкве змешчана яго копія.

За сваю шматвяковую гісторыю Барысаглебская царква перажыла некалькі перабудоў, рэлігійных канверсій, часы занядбання. Але галоўная небяспека крылася ў іншым. Каложскае плато, на якім стаіць Барысаглебская царква, паступова падмывалася водамі Нёмана. Падчас паводкі 1853 года ў раку абрынулася паўднёвая і частка заходняй сцяны храма. Каб прадухіліць канчатковае знішчэнне святыні, быў умацаваны бераг Нёмана, пабудавана каменная падпорная сцяна, а на месцы разбураных сцен пастаўлены драўляныя. Сёння старажытная царква — гэта не толькі мэта вандровак шматлікіх

экскурсантаў, але і дзеючы храм Беларускага экзархата Рускай Праваслаўнай Царквы.

У XIII-XIУ стагоддзях гродзенскі замак быў своеасаблівым ключом да зямель Беларускага Панямоння з боку Мазовіі і Тэўтонскага ордэна. Таму не дзіўна, што крыжакі неаднаразова імкнуліся авалодаць ім. Горад моцна цярпеў ад рабаванняў і пажараў. Пасля кожнага з крыжацкіх нападаў адбывалася аднаўленне ўмацаванняў на кручы трыццаціметровай Замкавай гары. Разумеючы важнае стратэгічнае значэнне Гродна, князь Вітаўт пасля пажару 1398 года загадаў будаваць новую цвярджу — магутны мураваны Верхні замак.

Было ўзведзена моцнае фартыфікацыйнае збудаванне, у плане блізкае да трохкутніка, што адпавядала канфігурацыі тэрыторыі пагорка. Працягласць сцен была каля 300 м, а таўшчыня іх месцамі дасягала 3 м. Па перыметру ўзвышаліся пяць магутных спічастых вежаў. Асноўным будаўнічым матэрыялам, з якога ўзводзілі сцены, быў камень-валун. Вялікапамерную цэглу-пальчатку ўжывалі ў муроўцы сцен, каб выраўняць рады валуноў, абліцаваць вежы, казематы.



***Стары замак***

Замак меў толькі адзін уезд, трапіць да якога было нялёгка. Да вежы ўязной брамы праз 50-мятровы сухі роў дугой падыходзіў драўляны мост з суседняга пагорка, дзе знаходзіліся ўмацаванні Ніжняга замка. Частка моста перад брамай была пад'ёмнай. Уязную вежу дадаткова абараняла высокая вежа, верагодна, тыпу бергфрыд, якая захавалася ад ранейшых умацаванняў. Дзве амаль квадратныя ў плане вежы знаходзіліся на нёманскім участку сцен і мысе па-над Гараднічанкай. Пятая вежа была прыбудавана да невялікага па памерах двухпавярховага палаца, які ўваходзіў у агульную сістэму замкавых умацаванняў. Вокны, звернутыя ў бок горада, мелі выгляд байніц. Магутныя контрфорсы ўмацоўвалі сцены і вежы. Уся архітэктура замка, які стаў прадстаўнічай княжацкай рэзідэнцыяй, мела рамана-гатычныя рысы.

Доўгі мірны перыяд, які пачаўся пасля перамогі пад Грунвальдам, не спрыяў належнаму захаванню замкавых умацаванняў, якія страцілі свае ранейшыя функцыі абарончага фарпоста. Збудаванні прыходзілі ў заняпад і паступова руйнаваліся.

Чарговая перабудова Верхняга замка пачынаецца, напэўна, пасля першага прыезду ў Гродна караля Стэфана Баторыя ў 1579 годзе. Сярэднявечны замак быў пераўтвораны італьянскімі дойлідамі Санці Гучы, Скота з Пармы і фартыфікатарам Рудальфіна да Камерына ў познерэнесансны рэпрэзентацыйны палацава-замкавы комплекс.

Значна павялічыўся палац. Першы паверх складаўся з пакоя варты, гаспадарчых камор, канцылярыі, скарбніцы і архіва. Звычайная тынкоўка сцен і скляпенняў у спалучэнні са сціплай плітачнай падлогай стваралі стрыманае, амаль аскетычнае аблічча першага паверха.

Другі паверх займалі каралеўскія пакоі — парадныя і жылыя, якія ўтваралі тыповую палацавую анфіладу. Пакоі караля мелі высокія разныя ці ляпныя столі, сцены былі аблямаваны паліраваным гіпсам. Іх упрыгожвалі каміны з разьбой, дэкаратыўныя каменныя парталы, а таксама падлога, выкладзеная мармуровымі пліткамі.

Палац меў высокі двухсхільны дах, накрыты чырвонай чарапіцай. У цэнтры галоўнага фасада знаходзілася парадная лесвіца ў выглядзе двух'яруснага рызаліту з аркадамі. Фасад з боку горада ўпрыгожвалі тры эркеры: па баках — шасціграннныя з купалападобнымі дахамі, а ў цэнтры — прамавугольны. Акрамя таго, фасады і франтоны аздабляла двухколернае шэра-белае сграфіта. Яно ўяўляла сабой пераважна раслінны арнамент у выглядзе фестонаў ці гірляндаў.

Нягледзячы на тое, што сцены палаца Стэфана Баторыя набываюць выгляд фасадаў свецкага будынка, абарончыя рысы па-ранейшаму прасочваюцца ў контрфорсах і тоўстых мурах палаца, яго шчыльнай сувязі з іншымі замкавымі пабудовамі. Брамная вежа, як і раней, мела пад'ёмны мост.

На паўночна-заходнім рагу замкавай пляцоўкі размясцілі казематы і цэйхгаўз, уздоўж заходняга мура — гарнізонная казарма, а ў вежы з боку Нёмана знаходзілася каралеўская лазня, а над ёй — «алебастравая зала». Тут кароль любіў адпачываць, любуючыся цудоўнымі занёманскімі краявідамі.

Сваю гродзенскую рэзідэнцыю Стэфан Баторый наведваў часта. Тут ён прымаў пасольствы, адсюль выступаў у ваенныя паходы, выязджаў на паляванні. Тут ён цяжка захварэў і памёр 12 снежня 1586 года.

У Старым замку заўсёды меўся арсенал. Так, у 1641 годзе ў ім захоўваліся даспехі на 600 чалавек, некалькі соцень мушкетаў і шпаг. Падчас руска-польскай вайны сярэдзіны XVII стагоддзя замак быў моцна пашкоджаны. Па яе заканчэнні і ў сувязі з тым, што ў Гродне было вырашана праводзіць дзяржаўныя сеймы Рэчы Паспалітай, тэрмінова пачалі рамонтныя работы. У 1678 годзе ў замку прайшоў першы сейм, які адкрыў кароль Ян III Сабескі. Але ў ходзе Паўночнай вайны замак зноў быў зруйнаваны. Яго перабудовай у канцы 30-х гадоў XVIII стагоддзя займаўся саксонскі архітэктар Карл Фрыдрых Пёпельман. Палац карэнным чынам быў перапланаваны — знікла вонкавая лесвіца і з'явілася ўнутраная, радыкальна перабудавалі ўсе флігелі. Канчаткова страцілі свой дэкор палацавыя фасады. Менавіта амаль у такім выглядзе палац дайшоў да нашых

часоў. У 20-30-я гады XX стагоддзя, калі тут уладкоўваўся музей, аблічча палаца змянілася зусім нязначна.

Ужо ў XVII стагоддзі ад вежы-брамы Старога замка да суседняга пагорка вёў каменны мост з 16-цю невялікімі вежачкамі і пад'ёмным звяном каля самой брамы. Гэта самы стары каменны мост, які захаваўся на Беларусі да нашага часу. Ён падыходзіць амаль да самой брамы другога каралеўскага палаца, які быў пабудаваны ў 1737-1742 гадах ужо згаданым К.Ф. Пёпельманам. Палац будаваўся як каралеўская рэзідэнцыя для Аўгуста III і адначасова як месца правядзення сеймаў Рэчы Паспалітай.



***Каралеўскі палац часоў праўлення Аўгуста III (Новы замак). Акварэль Ч. Роя***

Гэта быў час, калі ў архітэктуры панаваў стыль ракако. Галоўны двухпавярховы будынак палацавага комплексу ў плане нагадвае літару «П» і стварае парадны ўнутраны двор — курданёр, які замыкаецца дзвюма аднапавярховымі пабудовамі. У правай знаходзілася кардэгардыя — памяшканне для каралеўскай варты, а левая прызначалася пад пякарню. Паміж імі — агароджа і брама. Дарэчы, і сёння яны маюць такі самы выгляд, як у XVIII стагоддзі. На масіўных пілонах брамы змешчаны скульптуры міфічных істот — сфінксаў, якія нясуць пухлых пуццi. На слупах агароджы — шлемы з элементамі вайсковай атрыбутыкі.

Фасады палаца з боку курданёра ўпрыгожвалі пілястры, карнізы і лепка розных форм. На франтоне быў замацаваны герб Рэчы Паспалітай. Дах меў выгляд мансарды, ніжні схіл якой ажыўлялі невялікія люкарны. Маляўнічасць архітэктурных рашэнняў падкрэслівалася афарбоўкай: насычаны цагельны колер чарапіцы цудоўна гарманіраваў са светла-ружовымі і белымі плоскасцямі фасада.



***Вароты каралеўскага палаца. 1737-1742 гг.***

Яшчэ большую цікавасць уяўляў сабой інтэр'ер палаца. Адным з самых галоўных прынцыпаў архітэктуры ракако, як вядома, лічыцца анфілада, менавіта

яе імкнуўся ўвесці ў планіроўку палаца К.Ф. Пёпельман. Але дасягнуць гэтага ўдалося толькі ў правым крыле будынка, а ў цэнтральным і левым стварэнню анфілад замінаді вялікія двухсвятловыя Сенатарская і Пасольская залы.

Галоўны ўваход вёў у вестыбюль — Залу Варты. Адметнасцю гэтай залы быў упрыгожваючы яе фрэскавы роспіс, які імітаваў архітэктурныя дэталі. З Залы Варты вялі тры выхады. Выхад налева — да вялікай лесвіцы на другі паверх і да Сенатарскай залы, направа — у буфетную, прама — у першую прыёмную караля, якая больш вядома пад назвай Авальнай залы — першага такога архітэктурнага рашэння на беларускіх землях — двухсвятловай, з пышнай лепкай і фрэскамі. Насупраць вокнаў, у глухой сцяне залы, былі зроблены нішы, дзе маглі размясціцца карціны або вялікія люстры. Авальная зала таксама мела тры выхады: налева — у палацавую капліцу, прама — на знешні двор, а направа — у другую каралеўскую прыёмную. Далей у правым крыле палаца знаходзілася сталовая, трэцяя прыёмная для членаў сената, каралеўская аўдыенц-зала, а таксама апартаменты караля і каралевы.



*Галоўны фасад палаца Новага замка. Сучасны выгляд*

Уся левая палавіна цэнтральнай часткі палаца была занята Сенатарскай залай. Тут праходзілі пасяджэнні верхняй палаты сейма Рэчы Паспалітай. Сенатарская зала была аздоблена не з меншай раскошай, як Авальная. Гербы ваяводстваў дзяржавы былі размешчаны над вокнамі, сцены і столь упрыгожвалі ляпныя картушы і ракайлі. Гэтыя даволі аб'ёмныя аздабленні дапаўняліся фрэскавымі імітацыямі архітэктурных дэталяў. На ўзроўні другога паверха ў зале былі зроблены неширокія галерэі, агароджаныя дэкаратыўнымі кратамі. На галерэі падчас сесіі сейма магла знаходзіцца каралева з прыдворнымі дамамі, а таксама паслы і гледачы, так званыя арбітры. Каля сцяны, якая аддзяляла Сенатарскую залу ад капліцы, пад вялікім балдахінам з чырвонага шоўку стаяў каралеўскі трон, які зіхацеў пазалочанай разьбой. Справа і злева ад трона месціліся дзяржаўныя гербы — Белы Арол і Пагоня.

Амаль палавіну левага крыла палаца займала Пасольская зала, у якой праходзілі пасяджэнні ніжняй палаты сейма. Яна называлася Ізба паслоў. Планіроўка і аздабленне гэтай залы былі падобныя да Сенатарскай. Астатнюю частку левага крыла займалі памяшканні для прыдворных.

Першы сейм Рэчы Паспалітай у новым каралеўскім палацы адбыўся ў 1744 годзе, наступны - у 1752 годзе. Падчас правядзення пасяджэнняў выявіліся

недахопы палацавай планіроўкі. Больш за ўсё нязручнасцяў стварала капліца. Вось чаму было вырашана пабудаваць капліцу побач з цэнтральным корпусам палаца. У 1750 годзе кароль Аўгуст III зацвердзіў праект Іахіма Хрысціяна Яўха і адразу пачаліся работы. Знешне капліца вельмі нагадвала палац і мела высокі чатырохсхільны дах, пакрыты чарапіцай. Сцены ўпрыгожвалі пілястры і карнізы. Вокны, праўда, адрозніваліся ад палацавых — яны былі паўцыркульныя. Па грэбню даха стаялі прыгожыя дэкаратыўныя вазы. Невялікі пераход, які пачынаўся ад вонкавага выхаду з Авальнай залы, злучаў капліцу з палацам. Інтэр’ер яе, як і прадстаўнічых памяшканняў самога палаца, быў вытрыманы ў стылі ракако. Мноства лепкі ў выглядзе гірлянд, імітацыя ільвіных скураў, тканіны, люстэркавае скляпенне — усё гэта сваёй пышнасцю мусіла падкрэсліць багацце і моц дзяржавы.

Пры каралі Станіславе Аўгусце Панятоўскім першы сейм у Гродне збіраецца ў 1784 годзе. На гэты час палац патрабуе ўжо значнага рамонту, і сейм выдаткоўвае на яго правядзенне даволі буйную суму — 300 тысяч злотых. Падчас распачатага неўзабаве рамонту ва ўнутранай планіроўцы палаца адбываюцца змены. Яны закранаюць у асноўным другі паверх, куды пераводзяцца апартаменты караля. Кіруе работамі вядомы архітэктар, італьянец па паходжанні, Джузепе Сака. Упрыгожваннем палаца згодна густу Станіслава Аўгуста, вядомага прыхільніка класіцызму, займаўся дэкаратар Шыман Манькоўскі. Змяніла свой выгляд Сенатарская зала. Каралеўскі трон застаўся на ранейшым месцы, а ад яго з абодвух бакоў ішлі два рады сенатарскіх крэслаў. За імі, таксама з двух бакоў, стаялі лаўкі для паслоў. Паміж імі быў шырокі праход. У глыбіні залы, насупраць каралеўскага трона, стаяў столік сеймавага маршалка, а побач з ім — крэслы для вялікіх маршалкаў і міністраў.

Самай значнай гістарычнай падзеяй гэтага перыяду, якая звязана з палацам, стаў апошні сейм Рэчы Паспалітай 1793 года, на якім быў зацверджаны другі падзел дзяржавы паміж Расійскай імперыяй і Прускім каралеўствам. У ноч з 23 на 24 верасня 1793 года праходзіць т. зв. «нямое пасяджэнне» сейма, на якім ніхто з паслоў не ўзяў слова. Маршалак сейма вытлумачыў маўчанне як згоду паслоў з умовамі дагавора. Гэты гвалтоўны акт выклікаў шырокі рэзананс у самых розных колах грамадства і выліўся ў паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. 30 верасня 1794 года ў памяшканнях палаца Касцюшка сустракаўся з кіраўнікамі паўстання ў Вялікім княстве Літоўскім.

Пасля паражэння паўстання каралеўскі палац у Гродне зноў становіцца рэзідэнцыяй Станіслава Аўгуста Панятоўскага. 9 студзеня 1795 года ён атрымаў загад з Пецярбурга жыць у Гродне пад наглядам расійскага пасла М.В. Рэпніна. Менавіта тут 25 лістапада 1795 года кароль падпісвае акт адрачэння ад прастола, які стаў апошняй кропкай у гісторыі некалі найбуйнейшай еўрапейскай дзяржавы. Яна была канчаткова падзелена паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй.

Пасля таго, як 15 лютага 1797 года Станіслаў Аўгуст па выкліку імператара Паўла І выехаў у Пецярбург, палац у Гродне перадаецца ў распараджэнне расійскага ваеннага ведамства пад кадэцкі корпус, а пазней — вайсковы шпіталь, усё XIX і першую палову XX стагоддзя будынак палаца выкарыстоўвалі без змен.

У 1944 годзе, у час баёў за вызваленне Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў моцны пажар знішчае амаль усе палацавыя памяшканні, капліцу. Аднаўленчыя работы вяліся пад кіраўніцтвам архітэктара У.М. Вараксіна. З 1952 года тут размяшчаўся Гродзенскі абласны камітэт КПБ, а з 1991 года — абласная бібліятэка імя Я. Карскага і частка экспазіцый Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.

Побач з каралеўскімі палацамі знаходзіцца Свята-Раства-Багародзіцкі жаночы манастыр. На гэтым месцы ў XII стагоддзі была ўзведзена Прачысценская царква. Па ўсіх прыметах яе можна лічыць «роднай сястрой» Ніжняй і Барысаглебскай цэркваў. Знішчаная ў XVII стагоддзі бязлітасным пажарам, яна была даследавана археолагамі ў 1970-я гады.



*Свята-Раства-Багародзіцкі жаночы манастыр. 1-я пал. XVIII-XIX ст.*

Пасля чарговага пажару, які адбыўся на тэрыторыі манастыра базыльянак, заснаванага пры былой Прачысценскай царкве, у 1720 годзе па праекту архітэктара Іосіфа Фантана III на сродкі уніяцкага мітрапаліта Л. Кішкі пачалося будаўніцтва каменнага храма і жылых памяшканняў базыльянскага манастыра. У сілуэце царквы дамінуюць магутны купал з цыбулепадобнай галоўкай і вежы з фігурнымі купаламі. Храм мае рысы пераходнага стылю ад барока да класіцызму. У 1843 годзе базыльянскі манастыр быў пераўтвораны ў праваслаўны, які дзейнічаў да 1960 года. Аднаўленне манаскага жыцця і адраджэнне святыні пачалося ў 1992 годзе. У манастырскім храме знаходзіцца абраз Маці Божай Уладзімірскай, вядомы сваімі цудамі.

Яшчэ ў сярэднявеччы ўзнікла вуліца Замкавая, якая злучала паміж сабой замкі і гандлёвы цэнтр горада — Рынак. Пасля таго як Гродна стала месцам правядзення вальных сеймаў Рэчы Паспалітай, магнаты і заможная шляхта пачалі актыўна будаваць паблізу каралеўскіх палацаў свае камяніцы. У цэнтры горада паўстаюць рэзідэнцыі Агінскіх, Браніцкіх, Пацаў, Масальскіх, Радзівілаў, Храптовічаў. Большасць гэтых палацаў не захаваліся. Таму архітэктурны выгляд вуліцы Замкавай цяпер складаюць у асноўным пабудовы XIX стагоддзя, але ёсць тут і больш старажытныя будынкі.

*Вуліца Замкавая. Сучасны выгляд*



Да сярэдзіны XVIII стагоддзя адносяцца першыя звесткі аб доме № 16 — двухпавярховым мураваным палацы, які захаваў у сваім абліччы тыповыя рысы двух архітэктурных стыляў — барока і класіцызму. Першым з уладальнікаў яго, як сведчаць дакументы сярэдзіны XVIII стагоддзя, быў гродзенскі земскі пісар Караль Храптовіч. Хутчэй за ўсё, менавіта ён і пабудаваў палац у канцы 1740-х гадоў. Першапачаткова палац Храптовіча ўяўляў сабой тыповы ўзор сталага барока і быў узведзены паводле распаўсюджаных у Еўропе ў XVII - першай палове XVIII стагоддзя чарцяжоў так званых «дамоў для знаці». На жаль, пажары не абмінулі палац Храптовіча. Аднаўленне будынка звязана з імем наступнага яго ўладальніка — гродзенскага мечніка і віцэ-маршалка Галоўнага Літоўскага Трыбунала Францішка Мучыньскага. У 1791 годзе ён выкупіў камяніцу ў спадкаемцаў Антонія Тызенгаўза, знакамітага гродзенскага старасты, які ў свой час набыў «пустыя муры» палаца Храптовіча. Рэканструяваны ў стылі класіцызму, хаця і з элементамі барока, будынак захаваў свой вонкавы выгляд да нашых дзён.

Галоўны фасад камяніцы вызначаюць прастата і выразнасць форм, стрыманасць дэкаратыўнага ўбрання. Цэнтр сіметрычнай кампазіцыі — рызаліт з трыма вокнамі — завершаны высока ўзнесеным трохвугольным франтонам. У цэнтры галоўнага фасада - арка праезду. Звяртае на сябе ўвагу ляпны дэкор з матывамі ваеннай атрыбутыкі антычных часоў, а таксама ляпная гірлянда-вянок над уязной аркай. Цяпер у гэтым будынку знаходзіцца Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі.

Вуліца Замкавая хутка выводзіць нас на галоўную плошчу сучаснага Гродна — Савецкую.

Гэта плошча пачала фарміравацца ў XIV-XV стагоддзях як грамадска-эканамічны цэнтр горада і насіла назву Рынак. Тут былі пабудаваны ратуша і гандлёвыя рады, касцёлы, палацы. З цягам часу плошча мяняла свае назвы, знешні выгляд. Сёння тут можна бачыць шэраг разнародных як па часе, так і па стылі збудаванняў. Імпазантным выглядам сярод іх вылучаецца асабняк купца Мураўёва, вытрыманы ў неарускім стылі. Галоўны фасад трохпавярховага дома аздабляюць пілястры з чыгуннымі вензелямі, балконы з літымі агароджамі. Арнамент карнізаў, шатровыя пакрыцці з грабянямі - тыповыя элементы «рускага» стылю. У афармленні інтэр’ера дома выкарыстаны дэкаратыўная размалёўка і лепка.

Найгалоўнейшым упрыгажэннем плошчы быў і застаецца былы езуіцкі — фарны касцёл, сапраўдны шэдэўр мастацтва барока. Яго будаўніцтва пачалося ў

1678 годзе. На вялікі жаль, імя аўтара праекта невядома. 6 снежня 1705 года касцёл быў асвячоны ў гонар Святога Францыска Ксаверыя, паплечніка заснавальніка ордэна езуітаў Ігнація Лаёлы. Храм з'яўляўся адным з самых вялікіх касцёлаў эпохі барока ў Рэчы Паспалітай.

***Кафедральны касцёл***



Разам з іншымі пабудовамі Гродзенскага езуіцкага калегіума ён займаў значны па памерах квартал у цэнтры горада. Асобна трэба сказаць пра аптэку, якая ўваходзіць у гэты комплекс. Гэта старэйшая на Беларусі аптэчная ўстанова, заснаваная ў 1687 годзе, працягвае дзеннічаць і ў наш час у якасці аптэкі-музея.

Калі ў Гродне праходзілі сеймы, у езуіцкім калегіуме здавалі памяшканні для паслоў і сенатараў, адбываліся спектаклі школьнага тэатра. У час Паўночнай вайны тут гасцілі Аўгуст II і Пётр I, Станіслаў Ляшчынскі і Карл XII. У 1797 годзе касцёл становіцца прыходскім, а з красавіка 1989 года - кафедрай новаўтворанай Гродзенскай дыяцэзіі. 15 снежня 1990 года храму нададзены тытул меншай базілікі.

Строгі сілуэт касцёла ажыўляе пышны галоўны фасад, звернуты ў бок плошчы. Яго плоскасць аздабляюць падвойныя пілястры карынфскага ордэра, скульптурныя выявы апосталаў Пятра і Паўла, Францыска Ксаверыя (Г. Гіс, 1768), балкон і каваныя дзверы. Да ўваходнага партала вядзе двухмаршавая лесвіца, на парапеце — скульптура Збавіцеля, які нясе крыж (1898). Завяршаюць фасад дзве вытанчаныя вежы, аздобленыя вазонамі, увенчаныя ажурнымі крыжамі і выявамі анёлаў з трубамі.



На левую вежу ў 1725 годзе быў перанесены з разабранай вежы калегіума гадзіннік-куранты канца XVI - пачатку XVII стагоддзя, які першапачаткова месціўся на будынку гарадской ратушы. Гэта адзін са старажытнейшых вежавых гадзіннікаў у Еўропе.

***Гадзіннік канца XVI – gfxfnre XVII ст. На вежы касцёла Св. Францыска Ксаверыя***

Значную мастацкую каштоўнасць уяўляе сабой пышны і ўрачысты інтэр’ер касцёла з мноствам драўляных разных алтароў і роспісаў. Яго дамінанта — цэнтральны алтар (Я. Шміт з Рэшаля, 1736 - 1737), шэдэўр мастацтва барока. Паміж калонамі карынфскага ордэра ўстаноўлены шматлікія скульптурныя выявы. У цэнтры першага яруса — скульптура патрона храма Францыска Ксаверыя, вакол, паміж калонамі, змешчаны скульптуры дзесяці апосталаў, а на флангах - скульптуры Святога Самуэля і Святой Канстанцыі, аднайменных фундатарам алтара Самуэлю і Канстанцыі Лазавым. У цэнтры другога яруса — фігура Збавіцеля. Паабапал скульптуры чатырох евангелістаў і чатырох айцоў царквы. Завяршае алтар вянок-глорыя з воблакаў, ад якіх разыходзяцца промні. Перад глорыяй схіляюць галаву алегарычныя выявы чатырох кантынентаў.



*Галоўны неф касцёла Св. Францыска Ксаверыя*

Адзін з алтароў храма ўстаноўлены ў гонар нябеснага апекуна Вялікага княства Літоўскага Святога Казіміра. Алтарная карціна з выявай святога прыпісваецца пэндзлю вядомага беларускага мастака Валенція Ваньковіча. Уверсе - выява легендарнай бітвы пад Полацкам 1581 года. У абодвух ярусах алтара змешчаны скульптуры каралёў.

У капліцы Міхаіла Архангела захаваўся самы стары алтар касцёла, які датуецца XVII стагоддзем, а ў мураваным алтары (1772) капліцы Маці Божай Кангрэгацкай (Студэнцкай) знаходзіцца цудатворны абраз Маці Божай. Ен уяўляе сабой копію абраза «Маці Божая Снежная» з храма Санта-Марыя Маджорэ ў Рыме. Гэты невялікі абразок быў падораны канцлеру Вялікага княства Літоўскага Альбрыхту Станіславу Радзівілу. Войцэх Жэляроўскі, апошні ўладальнік абраза, у 1664 годзе падараваў яго Кангрэгацыі студэнтаў пры калегіуме езуітаў. Каля капліцы знаходзіцца лава, на якой у другой палове XVIII стагоддзя былі выкананы 16 жывапісных сюжэтаў з цудамі абраза Маці Божай Кангрэгацкай.

Цэнтральны неф, трансепт, сцены арганнага хору і прэсбітэрыума храма аздабляе фрэскавы роспіс — 14 сюжэтаў з жыцця Святога Ксаверыя (1752). Уражвае амбон, які ўпрыгожаны пазалочанай разьбой са скульптурнымі выявамі і ракайльным арнаментам. У інтэр’еры касцёла знаходзіцца помнік Антонію Тызенгаўзу (скульптар Т. Дыкас, 1886 - 1887), гродзенскаму старасце, падскарбію Вялікага княства Літоўскага. Помнік уяўляе сабой абеліск з лабрадарыту з выявай Тызенгаўза і бронзавай фігурай жанчыны, якая ўскладае пальмавыя галінкі. Фундатаркай помніка была Марыя Пшэздзецкая (з Тызенгаўзаў). Побач

знаходзяцца памятныя дошкі ў гонар вядомых ураджэнцаў Гродзеншчыны Урублеўскіх: Станіслава, інжынера-тэхнолага, і прафесараў Вітольда, Эдварда і Зыгмунта.

Наша вандроўка па каталіцкіх святынях Гродна працягваецца на высокім пагорку перад мастом праз Нёман, дзе велічна ўзвышаецца касцёл Адшукання Святога Крыжа і кляштар бернардзінцаў, пабудаваныя ў XVI - XVIII стагоддзях. У яго архітэктуры арганічна спалучаюцца элементы готыкі, рэнесансу, ранняга і позняга барока. На галоўным фасадзе звяртаюць на сябе ўвагу скульптуры ў арачных нішах - Святых Алены, Антонія, Бернарда.



***Від на касцёл Адшукання Святога Крыжа і кляштар бернардынцаў. Канец XVI-XVIII ст.***

Інтэр'ер храма вызначаецца багаццем аздаблення. Гэта архітэктурная пластыка ў выглядзе пілястраў, карнізаў арак, а таксама лепка, скульптуры, разьба па дрэву, вітражы вокнаў, манументальны жывапіс. На тымпане арачнай перагародкі прэсбітэрыя ўражвае манументальная фрэскавая кампазіцыя «Небаўзяцце Марыі» (А. Грушэцкі, Ф. Міхалкевіч, XVIII ст.). Звяртае на сябе ўвагу Латэранская капэла (злева ад уваходу), пластычна-скульптурны ансамбль якой, выкананы ў канцы XVII стагоддзя, складаюць кампазіцыя «Святая сям'я», фігуры чатырох евангелістаў, Святых Цэцыліі, Уршулы, Малгажаты Антыяхійскай, пуцці.

Каля паўднёвага фасада касцёла ўздымаецца ў неба званіца. Два яе верхнія, вытанчанай формы ярусы з фігурным купалам і шпілем былі дабудаваны ў другой палове XVIII стагоддзя. Да званіцы прымыкае кляштарны корпус. Цяпер тут размяшчаецца Вышэйшая рымска-каталіцкая духоўная семінарыя.

У XVII - XVIII стагоддзях у кляштары час ад часу збіраліся павятовыя сеймікі. У 1858 годзе ў касцёле Адшукання Святога Крыжа адбылося вянчанне Пятра Ажэшкі і Элізы Паўлоўскай, будучай вядомай пісьменніцы Элізы Ажэшкі, жыццёвы і творчы шлях якой цесна звязаны з Гродна.

Працягваючы знаёмства з хрысціянскімі храмамі горада, рушым на вуліцу К. Маркса, дзе сярод шчыльнай забудовы XIX - пачатку XX стагоддзя перад намі паўстануць муры кляштара, які быў пабудаваны ў 1634-1642 гадах. Кляштар ордэна брыгітак фундаваў маршалак Вялікага княства Літоўскага Крыштоф Весялоўскі і яго жонка Аляксандра з Сабескіх, якія засноўваюць яго ў памяць заўчасна памерлай прыёмнай дачкі Грызельды Сапегі.

Ад нясціплых позіркаў гараджан насельніц кляштара хавалі высокія муры з шасціграннымі вежамі па кутах. Адразу за мурамі ўзвышаецца касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзеве Марыі, які належыць да помнікаў ранняга барока. Бакавыя квадратныя вежачкі на яго галоўным фасадзе аздоблены вытанчанымі пілястрамі карынфскага ордэра. Адметнасць храма — фасадны фрыз, які выкананы ў тэхніцы сграфіта ў выглядзе расліннага арнаменту і выяў міфалагічных істот.



***Касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзеве Марыі і мураваная агароджа кляштара брыгітак. XVII ст.***

У касцёле захоўваліся рэліквіі Святога Клімента (заступніка горада), а таксама былі змешчаны жывапісныя партрэты фундатараў храма Весялоўскіх і Грызельды Сапегі (карціны цяпер у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь).

З поўдня да касцёла прылягае будынак кляштара, карпусы якога ўтвараюць унутраны прамавугольны дворык. З гаспадарчых пабудоў найбольшую цікавасць уяўляе драўляны лямус XVII стагоддзя. Лямус складзены з масіўных драўляных брусоў, усе канструктыўныя элементы звязаны ўрубкамі і драўлянымі клінамі. Галоўны паўночны фасад упрыгожвае двух’ярусная арачная галерэя з балюстрадай на другім паверсе. Такіх старажытных узораў драўлянага дойлідства амаль не засталося на Беларусі.



*Лямус. XVII ст.*
*Галоўны фасад*

Знаёмства з яшчэ адной каталіцкай святыняй Гродна чакае нас у занёманскай частцы горада. Тут, на ўзвышшы левага берага ракі, у маляўнічым месцы размясціўся комплекс былога кляштара манаскага ордэна францысканцаў. Кляштарныя пабудовы вызначаюцца стрыманымі архітэктурнымі формамі. Зразумела, гэта невыпадкова. Менавіта сціпласць ва ўсім павінна была нагадваць насельнікам кляштара і парафіянам аб жабрацкім ідэале айцоў-францысканцаў, паслядоўнікаў ці не самага вядомага і папулярнага святога каталіцкага свету — Францыска Асізскага. Кляштар быў заснаваны ў 1635 годзе. Ён складаецца з касцёла, мураваны будынак якога быў узведзены ў першай палове XVIII стагоддзя, а таксама вежы-званіцы, жылога корпуса і агароджы. Касцёл і двухпавярховы жылы корпус утвараюць замкнёны ўнутраны двор. Складаны рэльеф абумовіў асіметрычную кампазіцыю кляштара.

Касцёл Маці Божай Анёльскай — трохнефавая шасціступовая базіліка з даволі стрыманай пластычнай аздобай фасадаў. Акцэнт касцёльнага інтэр’ера — галоўны алтар у стылі позняга барока са скульптурамі Св. Францыска і Антонія Падуанскага. Сапраўдным шэдэўрам лічыцца алтарная перагародка. Яе ўпрыгожваюць фігурныя панелі, гірлянды, вазы і бюсты. Акрамя гэтага ў касцёле захаваліся барочны амбон, абразы XVIII-XIX стагоддзяў і арган, упрыгожаны разьбой у стылі ракако. Яскравым прыкладам познебарочнай пластыкі з’яўляецца трох’ярусная, увенчаная фігурным купалам званіца.

Будаўніцтва праваслаўных храмаў аднаўляецца ў Гродне ў другой палове XIX стагоддзя. У занёманскай частцы горада ў 1895 годзе закладваецца Свята-Уладзімірская царква-школа. Мураваны храм быў выкананы паводле праекта інжынера І.К. Плотнікава. Маляўнічы сілуэт царквы складаюць двух’ярусная званіца, якая завяршаецца шатром з макаўкай, прамавугольныя ў плане трапезная, малітоўны зал і пяцігранная апсіда. Дэкор сцен стылізаваны пад дэкор старажытнарускага дойлідства. Наогул, для пабудоў неарускага стылю характэрна майстэрская мuроўка з якаснай цэглы.

Галоўны храм Гродзенскай епархіі — Свята-Пакроўскі сабор, кафедра епіскапа Гродзенскага і Ваўкавыскага, які знаходзіцца на вуліцы Ажэшкі. Ён быў пабудаваны з мэтай ушанавання памяці афіцэраў і ніжніх чыноў 26-й артылерыйскай брыгады і 101-га пяхотнага Пермскага палка, якія загінулі ў руска-японскую вайну. Храм-помнік, праект якога быў распрацаваны архітэктарам

інжынернага ўпраўлення Віленскай ваеннай акругі М. Прозаравым, быў вытрыманы ў неарускім стылі. Архітэктура храма мае насычанае дэкаратыўнае ўбранне. У сілуэце дамінуе шатровая званіца з макаўкай і чацвярык з пяцікупаллем над алтарнай часткай. Атынкаваныя фасады багата аздоблены какошнікамі, вітымі калонкамі, мудрагелістымі ліштвамі, якія абрамляюць вокны. Да трох арачных уваходаў на галоўным фасадзе вядзе высокі ганак. На сценах пры ўваходзе ўстаноўлены памятныя дошкі ў гонар загінуўшых на руска-японскай вайне і савецкіх салдат, якія ваявалі ў Афганістане. Унутраная прастора дзеліцца дванаццаццю слупамі. Інтэр’ер упрыгожваюць арнаментальная размалёўка перакрыццяў нефаў і разныя драўляныя іканастасы, якія таксама маюць неарускую стылявую трактоўку. З 1935 года ў саборы знаходзіцца ў спецыяльна ўладкаванай капліцы, асабліва шануемы гродзенцамі абраз Маці Божай Казанскай (раней знаходзіўся ў Свята-Сафійскім саборы г. Гродна).

***Свята-Пакроўскі кафедральны сабор. Пач. XX ст.***



На працягу стагоддзяў значную частку насельніцтва горада складалі яўрэі. Большасць яўрэйскіх культавых будынкаў — сінагог была ў розныя часы знішчана спусташальнымі пажарамі. Да нашых дзён захавалася мураваная сінагога на вуліцы Вялікай Траецкай. Як лічаць некаторыя даследчыкі, яна была пабудавана італьянскім архітэктарам Санці Гучы ў 1578 годзе. Галоўны фасад яе аздаблялі квадратныя ў сячэнні вежы. Паміж вежамі, на ўзроўні першага паверха знаходзілася тэраса. У 1899 годзе сінагога была моцна пашкоджана пажарам. Пасля рамонту буды-нак набыў рысы неарускага архітэктурнага стылю.

Мяркуючы па кампазіцыйнаму і дэкаратыўнаму вырашэнню фасада, рэканструяваў сінагогу архітэктар, які будаваў дом купца Мураўёва. Трохпавярховы квадратны ў плане будынак сінагогі быў накрыты двухсхільным дахам. Вежы атрымалі кілепадобныя завяршэнні з купальным пакрыццём і металічнымі грабянямі. Астатнія фасады багата дэкарыраваны рустам і ліштвамі лучковых і арачных вокнаў.

Усю вышыню асноўнага аб’ёму будынка займае галоўная зала. У цэнтры ўзвышаецца біма, слупы якой падтрымліваюць крыжовыя скляпенні з нервюрамі. Усходняя сцяна залы вылучана ў цэнтры пяцігранным выступам, а заходняя — галерэяй, якая адкрываецца ў залу двухпралётнымі арачнымі праёмамі. Лесвічныя ўваходы на яе зроблены ў бакавых вежах. У інтэр’еры захавалася ляпная арнаментацыя ў гатычнай і рэнесанснай трактоўцы.

З Вялікай Траецкай праз завулак трапляем на вуліцу Элізы Ажэшкі. Амаль на самым пачатку вуліцы, побач з сучасным васьміпавярховым гмахам аблвыканкама, бачым узведзены ў 1803 годзе ў стылі класіцызму дом гродзенскага віцэ-губернатара К. Максімовіча. У 1812 годзе ў ім размяшчаўся штаб французскіх войскаў. Амаль стагоддзе будынак быў прыватнай уласнасцю, а з 1920 года тут месцілася староства, цяпер — аблвыканкам. Гэты двухпавярховы мураваны будынак, калі паглядзець на яго з вышыні, нагадвае вялікіх памераў літару «Г», доўгая частка якой цягнецца амаль што на квартал. Сіметрыю галоўнага фасада падкрэслівае чатырохкалонны порцік дарычнага ордэра з трохвугольным франтонам. Аконныя праёмы будынка аздабляюць фігурныя ліштвы і сандрыкі. У свой час інтэр'еры дома ўпрыгожваў фрэскавы роспіс.

Яшчэ некалькі крокаў, і мы перасякаем нябачную мяжу, за якой на месцы каралеўскага фальварка Гарадніца ў другой палове XVIII стагоддзя разгарнулася будаўніцтва новага Гродна. Праект забудовы Гарадніцы быў заказаны старастам Гродзенскай каралеўскай эканоміі А. Тызенгаўзам саксонскаму архітэктару Іагану Мёзеру і італьянцу Джуяетте Сака. На працягу пятнаццаці гадоў тут было ўзведзена 85 будынкаў, якія склалі прамысловую, адміністрацыйную і навукова-культурную зоны.

Ад тагачаснага ансамбля захавалася некалькі камяніц. Большасць з іх сканцэнтравана на плошчы, якая зараз носіць імя Антонія Тызенгаўза. Гэта, перш за ўсё, дом віце-адміністратара, дзе знаходзілася кантора для служачых, якія займаліся зборам падаткаў. Будынак сціплы і просты, мае рысы стыляў барока і класіцызму. Галоўны фасад аздоблены лапаткамі, філёнкамі, больш нізкі другі паверх аддзелены карнізным поясам. Завяршае будынак вальмавы дах. У XIX стагоддзі тут размяшчалася паштовая кантора, а цяпер — Нацыянальны гістарычны архіў у Гродне.

***Будынак былой музычнай школы на Гарадніцы. 1760-я гг. Сучасны выгляд***



Насупраць - музычная школа. Архітэктура гэтага будынка вылучаецца адметнасцю. Яго часта называюць «крывой афіцынай», і сапраўды - у плане ён крывалінейны. Іншым разам дом называюць «музычны флігель», паколькі прызначаўся ён і для правядзення канцэртаў. На першым паверсе калісьці па ўсяму фасаду ішла галерэя з аркадай, цэнтр якой быў вылучаны вялікай аркай. Дах меў характэрны для барочных пабудоў залом і быў пакрыты чарапіцай. У XVIII стагоддзі на першым і другім паверхах школы былі класы, а ў мансардзе

жылі вучні і настаўнікі. Дзякуючы гэтай школе ў Гродне быў створаны свой аркестр і балетная трупа. Пазней галерэю замуравалі, мансарда набыла выгляд трэцяга паверха, на фасадзе з'явіліся балконы.

За мастом праз ручай Юрыдыка знаходзіцца былы палац адміністратара. Ен завяршае кампазіцыю авальнай плошчы. Як і большасць пабудоў на Гарадніцы таго часу, палац меў рысы ранняга класіцызму. Галоўны корпус трохпавярховы, прамавугольны, а па баках сіметрычна пастаўлены аднапавярховыя флігелі. Галоўны фасад палаца раней упрыгожвалі пілястры і франтон, а цяпер на ўзроўні 2-га і 3-га паверхаў мы бачым толькі лапаткі. Прыгожыя дзверы вялі ў прасторны вестыбюль з шырокай лесвіцай. На другім паверсе быў балкон, з якога адкрываўся цудоўны від на ўсю плошчу. Тут знаходзілася высокая парадная зала. Нейкі час палац належаў графу М. Валіцкаму, а потым быў набыты праваслаўнай кансісторыяй, таму і атрымаў назву «архірэйскі дом».

Вяртаючыся праз плошчу, мы бачым у двары «крывой афіцыны» яшчэ адну цікавую камяніцу. Гэта - будынак лясной адміністрацыі. Дом прамавугольны, масіўны, з мансардамі на тарцовых фасадах, высокім вальмавым дахам. Зараз гэта жылы дом. Чарговы помнік - лямус, які мае прывабны выгляд дзякуючы ўдалым прапорцыям, высокаму вальмаваму даху, элементам фахверкавай пабудовы.

Непадалёк - тэатр. Яго будынак пачалі ўзводзіць яшчэ пры Антоніі Тызенгаўзе. Тэатральная зала была спраектавана па так званай італьянскай крывой і ўяўляла сабой паўкруглае памяшканне з амфітэатрам ды яруснымі галерэямі. У зале налічваліся 22 ложы і партэр. Сцэна была абсталявана кулiснымі машынамі для дэкарацый. Тэатральны будынак неаднаразова рэканструяваўся і ў выніку значна павялічыўся, у ім з'явіўся трэці паверх. Цяпер тут працуе Гродзенскі абласны тэатр лялек.




*Тэатр. XVIII ст.*
*Сучасны выгляд*

Побач знаходзіцца пабудова, у якой працавала медыцынская акадэмія, створаная французскім вучоным-натуралістам Жанам Эмануэлем Жылiберам. Будынак добра адпавядаў свайму прызначэнню. Па баках калідораў размяшчаліся класы, прадугледжваліся кабінеты для выкладчыкаў і лабараторыі. Фасад аздаблялі пілястры, па баках былі два масіўныя гранёныя вежападобныя рызаліты з купальным завяршэннем. Будынак меў строгі і ў той жа час вытанчаны выгляд. Пазней ён некалькі разоў перабудоўваўся і значна змяніў свой першапачатковы выгляд.

*Будынак былой медыцынскай акадэміі на Гарадніцы. 1770-я гг. Сучасны выгляд*



Галоўная магістраль Гарадніцы - вуліца Раскоша (цяпер вуліца Ажэшкі). У яе цэнтры ўзвялі 20 жылых аднатыпных дамоў для замежных майстроў. Гэта прыклад першай на Беларусі тыповай жыллёвай забудовы. З іх захаваўся толькі адзін. Ен кампактны, у плане амаль квадратны. Фасад, які выходзіць на вуліцу, цагляны і атынкаваны. Франтон мае барочную канфігурацыю. Астатнія сцены - з драўлянага брусу. Такое спалучэнне будаўнічых матэрыялаў дало магчымасць за мінімальныя сродкі стварыць уражанне забудовы вуліцы каменнымі дамамі. Цяпер у гэтым доме месціцца Музей гісторыі Гарадніцы.

Зусім недалёка знаходзіцца былая загарадная летняя рэзідэнцыя караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Аўтар праекта сядзібы Станіслава ва - Джузепе Сака. Палацава-сядзібны дом уяўляе сабой двухпавярховую барочную пабудову з элементамі архітэктуры класіцызму. Палац, нягледзячы на свае сціплыя памеры, мае вытанчанае аздабленне фасадаў і інтэр’ераў. Цэнтральная частка галоўнага фасада вылучана рызалітам з фігурным атыкам і тэрасай, а цэнтр дваровага фасада - паўкруглым эркерам. Палац, які стаіць на пагорку і яго бакавыя аднапавярховыя флігелі, размешчаныя ніжэй, ствараюць парадны курданёр.

Рост горада ў XIX стагоддзі звязаны з забудовай так званага Новага Свету. Тут на Якаў праспекце (цяпер вуліца 1 Мая) прайшлі раннія дзіцячыя гады класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. У доме, дзе жыла сям’я Багдановічаў, цяпер дзейнічае музей паэта.

Паблізу ўзвышаецца лютэранская кірха Святога Яна, якая была пабудавана ў канцы XIX - пачатку XX стагоддзя. Гэта быў час рамантычнай моды на готыку. Храм, вытрыманы ў духу неаготыкі, выглядае вельмі маляўніча. Найбольш уражвае высокая манументальная вежа-званіца на галоўным фасадзе. У ёй пад акном-ружай знаходзіцца аздоблены вялікім стральчатым парталам галоўны ўваход у храм. Бакавыя фасады ўмацаваны контрфорсамі. У стральчатых вокнах — вітражы.



*Лютэранская кірха Святога Яна. Кан. XIX - пач. XX ст.*

Вяртаючыся ў цэнтр горада, спынімся на вуліцы Ажэшкі каля аднапавярховага дома з мансардай (дом № 17). Гэты будынак - дакладная копія драўлянага дома, у якім у 1894 - 1910 гадах жыла ганаровая грамадзянка Гродна пісьменніца Эліза Ажэшка. Дом належаў яе другому мужу адвакату Станіславу Нагорскаму. У гэтых сценах убачылі свет шэраг твораў пісьменніцы, тут не раз прымала яна Марыю Канапніцкую, Францішка Багушэвіча і іншых вядомых і пачынаючых літаратараў. Цяпер тут знаходзіцца філіял Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага, можна агледзець мемарыяльныя пакоі Э. Ажэшкі.

*Дом пісьменніцы Элізы Ажэшкі*



У забудове суседняй вуліцы Леніна несумненна вылучаецца сваімі маштабамі будынак былога пазямельна-сялянскага банка, які быў узведзены ў 1909 - 1913 гадах на перакрыжаванні тагачасных вуліц Сафійскай і Паліцэйскай паводле праекта грамадзянскага інжынера Б.П. Астравумава. У вуглавой частцы будынак мае манументальны рызаліт са строга геаметрычнай формы ўваходам, вузкімі прамавугольнымі вокнамі і квадратнымі люкарнамі. Вянчае рызаліт вялікі шацёр, накшталт шлема быліннага асілка. З параднага вестыбюля па шырокай лесвіцы, якая аздоблена металічнымі парэнчамі ў стылі мадэрн, можна было падняцца ў аперацыйную залу банка.

Насупраць банка ў той жа час і ў тым жа стылі мадэрн быў пабудаваны асабняк, які належаў вядомаму ў горадзе ўрачу Аляксандру фон Тальгейму (дом № 22). Двухпавярховы будынак складаецца з трох аб'ёмаў. Сярэдні з іх аформлены як вуглавая вежа. Ён пакрыты высокім шатровым дахам, які называюць «палатка з грэбенем». У дэкоры фасадаў выкарыстаны керамічныя ўстаўкі, каляровае шкло, фактурная тынкоўка.

Шпацыраваць па вуліцах і плошчах Гродна - усё роўна што з трапяткой зацікаўленасцю гартаць стары фаліянт, на кожнай са старонак якога сустракаецца нешта новае, нечаканае.